


## 8-га САКАВІКА — ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН
## СА СВЯТАМ!

*Шаноўныя прадстаўніцы лепшай палавіны чалавецтва!*

Праз два дні вы ўпершыню будзеце адзначаць у новым XXI стагоддзі і трэцім тысячагоддзі сваё свята. І ўжо адна гэта акалічнасць павінна надаць яму асаблівую ўрачыстасць і запамінальнасць. Тым больш, што ваш дзень спалучаюць з надыходам вясны, ажыўленнем прыроды, спадзяваннямі на добрую перспектыву, здзяйсненнем запаветных задум і ўласных мар.

Горача і сардэчна віншуем усіх жанчын універсітэцкага калектыву з надыходзячым святам. Моцнага вам здароўя, асабістага і сямейнага дабрабыту, плённай працы, а студэнткам — выдатнай вучобы, актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, новых вышынь у дасягненні пастаўленых мэт.

Мы перакананы, што жанчыны Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны — флагмана вышэйшай школы Палескага рэгіёна — і ў далейшым будуць памнажаць яго лепшыя традыцыі, з гонарам выконваць свае паўсядзённыя абавязкі на карысць нашай незалежнай, суверэннай Айчыны.

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

* * *

*Дарите женщинам себя.*
*Они на меньше не согласны.*
*Они нежны и так прекрасны.*
*Лишь ради них живет Земля.*

*Дарите женщинам цветы.*
*Они к цветам питают слабость.*
*О, эта томная усталость*
*Их неподдельной красоты.*

*Дарите женщинам мечты.*
*Они безумно романтичны.*
*Прелестной стройностью — античны.*
*Природной нежностью — чисты.*

*Дарите женщинам любовь.*
*Ее без женщин не бывает.*
*От глаз небесных сердце тает.*
*Дарите женщинам любовь.*

**Станислав ГАЛКОВСКИЙ, студент 2 курса физического факультета.**

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

*№ 5 (998)* | *АЎТОРАК, 6 сакавіка 2001 г.* | *Газета заснавана ў верасні 1969 года* | *Выходзіць два разы ў месяц* | *Цана дагаворная*



## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Даволі насычаным быў парадак дня лютаўскага пасяджэння Савета універсітэта. Аб рабоце Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў далажыў яго дырэктар дацэнт А.А.Малахаў. Пяцігадовай дзейнасці Франка-Беларускага інстытута кіравання было прысвечана выступленне яго садырэктара дацэнта А.У.Гаўрылюка. Аб выніках атэстацыі навукова-педагагічных кадраў універсітэта на вучоныя званні ў 2000 годзе праінфармаваў вучоны сакратар В.Ю.Залатарэнка.

Па інфармацыі начальніка вучэбнага аддзела Н.І.Папковай студэнтам назначаны імянныя стыпендыі.

Аб выніках фінансавай дзейнасці ГДУ за мінулы год Савету далажыла галоўны бухгалтар І.А.Курава, аб аздараўленні студэнтаў — старшыня студэнцкага прафкома Н.І.Колтышава.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: дацэнт Л.С.Баннікава — загадчыкам кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы, С.М.Дзегцяроў — ст. выкладчыкам кафедры фізічнага выхавання і спорту, доктар фізіка-матэматычных навук С.М.Курылкіна — прафесарам кафедры оптыкі.

Рэктар універсітэта прафесар М.В.Селькін зрабіў паведамленне аб стварэнні і першым пасяджэнні Савета рэктараў Рэспублікі Беларусь.

Былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

## УРУЧАНЫ ДЫПЛОМЫ МІНІСТЭРСТВА

За якаснае кіраўніцтва навуковымі даследаваннямі студэнтаў нашага універсітэта Дыпломамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны прафесар кафедры агульнай фізікі І.М.Мельнічэнка, дацэнты: В.М.Капшай — з кафедры тэарэтычнай фізікі, Т.І.Панова — з кафедры бухуліку, кантролю і АГД, Л.В.Фядосенка — з кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю, В.К.Шынкарэнка — з кафедры беларускай літаратуры, загадчык кафедры камерцыйнай дзейнасці і фінансаў Р.Я.Кобрынскі, старшыя выкладчыкі: Я.А.Броўкін — з кафедры ўсеагульнай гісторыі, П.П.Верасовіч — з кафедры дыфураўненняў, У.Я.Пашук — з кафедры геаграфіі.

Дыпломы Міністэрства ўручаны названым навукоўцам на пасяджэнні Савета універсітэта.

## НЕ ЧАКАЕ СПАКОЮ ДУША



**Сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу ГДУ — палова жанчын. І ў своеасаблівым "табелі аб рангах" у іх даволі высокі рэйтынг — ад асістэнта да доктара навук. Апошнюю з названых вучоную ступень у нас маюць чатыры прадстаўніцы слабага полу. Адна з іх — загадчык кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі Ірына Міхайлаўна ЕЛІСЕЕВА.**

Пра такіх як яна звычайна кажуць: "дзелавая жанчына". Пры гэтым азначэнні асацыятыўна ўяўляеш сабе строгую, патрабавальную асобу, якая ўсё падпарадкоўвае на карысць даручанай ёй справе. Але Ірыну Міхайлаўну ў рамкі толькі такога вобразу ніяк не "ўціснеш". Яе навуковыя, арганізацыйныя, адміністратарскія абавязкі як кіраўніка немалога па колькасці работнікаў калектыву, выкладчыцкая праца зусім не пераважаюць над такімі якасцямі, як абаяльнасць, сапраўдная жаноцкасць, прывабнасць і добрае пачуццё гумару. Усё гэта разам узятае арганічна спалучаецца ў яе характары, што робіць асобу гэтай жанчыны цікавай і шматграннай.

Яе жыццё, як кажуць, у самым зеніце. І на гэтай найвышэйшай адзнацы набытага вопыту ў І.М.Елісеевай ужо нямала здабыткаў і поспехаў — пройдзены шлях ад выпускніцы (з чырвоным дыпломам) фізічнага факультэта ГДУ да доктара тэхнічных навук. Каб дасягнуць гэтага, неабходны не толькі прыроджаны дапытлівы розум, але і сіла волі, цвёрдасць характару, мэтанакіраванасць. Усё гэта ў Ірыны Міхайлаўны ёсць яшчэ са школьных гадоў, якія прайшлі ў невялічкім гарадку Унеча, што на Браншчыне. І тады яна была лідэрам як у вучобе, так і ў грамадскім жыцці. А прыступкамі да апошняга высокага рубяжа сталі студэнцкая актыўная навуковая работа, вучоба ў аспірантуры ГДУ, абарона ў Інстытуце механікі металапалімерных сістэм НАНБ кандыдацкай дысертацыі, выкананай пад кіраўніцтвам прафесара Д.Р.Ліна, праца м.н.с. у НДС універсітэта, асістэнтам кафедры агульнай фізікі, ст. выкладчыкам кафедры псіхалагічнай дыягностыкі давузаўскай падрыхтоўкі.

Рашэнне "засесці" за доктарскую было ў яе настолькі моцным і непераадольным, што пачала над ёй працаваць нават без навуковага кансультанта. Хімія кампазіцыйных матэрыялаў — такім быў яе напрамак, Савета па абароне якога ў Беларусі няма. Абарона прайшла паспяхова ў Санкт-Пецярбургскім тэхналагічным універсітэце, дзе яе апанентамі былі вядомыя расійскія вучоныя.

Вось ужо два гады І.М.Елісеева ўзначальвае кафедру давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі. У адным з пакояў вучэбнага корпуса № 5, дзе яна размяшчаецца, неяк па-асабліваму цёпла, утульна і прыгожа. Рука сапраўднай гаспадыні адчуваецца тут ва ўсім. І нібыта ў пацвярджэнне майго ўражання ад убачаннага дэкан факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі В.І.Яцухна, які зайшоў сюды па неадкладных справах, сказаў:

— Ірына Міхайлаўна — вельмі кантактны, камунікабельны чалавек, адначасова і строгі, і вясёлы, з ёй хутка можна вырашыць любое пытанне. Яна клапоціцца аб членах кафедры, але не пацерпіць з боку падначаленых недобрасумленных адносін да працы.

І ўсё гэта толькі на карысць агульнай справе — садзейнічаць у цесным узаемадзеянні з усімі факультэтамі універсітэта высокаякаснай падрыхтоўцы абітурыентаў для паступлення ў ГДУ, удасканальваць прафарыентацыйную работу. Пачынаючы з бягучага года на кафедры выконваецца навуковая тэма, у рамках якой працуе навукова-метадычны семінар і праводзяцца штогадовыя абласныя канферэнцыі. Распрацоўваюцца крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў на ўступных экзаменах, а ў перспектыве — стварэнне па кожнай дысцыпліне вучэбна-метадычнага камплекта, у які будуць уваходзіць спецыяльныя праграмы, тэсты, метадычныя дапаможнікі для абітурыентаў і настаўнікаў.

Спраў і задум у калектыва кафедры шмат. Але невычэрпная энергія, ініцыятыўнасць яе загадчыка І.М.Елісеевай, якая да таго ж з'яўляецца на працягу многіх гадоў прафоргам факультэта, членам прафкома ГДУ, безумоўна, дапамогуць іх паспяхова ажыццяўляць.

**Т.ДУБЯК.**
**Фота У.Чысціка.**

## У ПАДМОГУ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

На падставе Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 71 ад 8 лютага 2001г. у мэтах аказання комплекснай падтрымкі развіццю вышэйшай школы ў Рэспубліцы Беларусь было прынята рашэнне аб стварэнні Рэспубліканскага савета рэктараў вышэйшых навучальных устаноў і зацверджана адпаведнае Палажэнне аб ім. Напрыканцы другой дэкады лютага адбылося яго ўстаноўчае пасяджэнне, на якім былі разгледжаны арганізацыйныя пытанні. Старшынёй Рэспубліканскага савета рэктараў ВНУ абраны рэктар Белдзяржуніверсітэта А.В.Казулін.

Членам прэзідыума Рэспубліканскага савета рэктараў і састаршынёй адной з яго камісій абраны рэктар нашага універсітэта, старшыня Савета рэктараў Гомельшчыны прафесар М.В.Селькін.

## ПРЫВІТАЛЬНЫ АДРАС — ЮБІЛЯРУ

23-га лютага — у Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь — адзначыў свой 50-гадовы юбілей выпускнік 1976г. біялагічнага факультэта нашага універсітэта, а цяпер рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай, доктар біялагічных навук, прафесар **В.В.Валетаў.** З нагоды гэтай падзеі ва ўзначальваемай ім ВНУ адбылося ўрачыстае пасяджэнне Савета інстытута, на якім было выказана шмат цёплых слоў аб навукова-педагагічнай, арганізатарскай і грамадскай дзейнасці Валянціна Васільевіча. Яму былі ўручаны шматлікія памятныя падарункі.

Ад калектыву нашага універсітэта юбіляра цёпла павіншавалі і ўручылі яму прывітальны адрас і памятны падарунак рэктар, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін і старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты эканамічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры бухуліку, кантролю і АГД **Бабіна Іну Уладзіміраўну** з выпадку зацвярджэння яе БелВАКам у вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.*

## УДАСТОЕНЫ ПРЭМІІ ПРЭЗІДЭНТА

Савет спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў прыняў рашэнне аб заахвочванні педагогаў і вучоных за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей адоранай моладзі. Другой прэміі ў памеры 108 тыс. руб. удастоены загадчык кафедры экалогіі нашага універсітэта кандыдат біялагічных навук, дацэнт **А.М.Кусянкоў.** Віншуем!

# НА ПЕРШЫХ ПРЫСТУПКАХ ДА МАРЫ



У кожным чалавеку яго лепшыя якасці выпрацоўваюцца з дзяцінства. Гэта, як кажуць, прапісная ісціна. Не іншай думкі прытрымліваецца і Вікторыя Савошчанка. На ўласным вопыце яна пераканалася, што без працалюбства, дысцыплінаванасці, мэтанакіраванасці не даб'ешся поспеху ў любой справе. І найперш для яго дасягнення цяпер патрэбны сучасныя грунтоўныя веды, шырокі кругагляд, уменне праявіць сябе ў любой сітуацыі.

Да ўсяго вышэйсказанага Вікторыя імкнулася са школьнай парты. А вучылася яна ў Руднянскай сярэдняй школе Мазырскага раёна. Тут яна вызначалася не толькі выдатнай вучобай, але і арганізатарскімі здольнасцямі. Без яе актыўнага ўдзелу не абыходзілася ні адно школьнае мерапрыемства. У вольны час яна асабліва любіла памаляваць, правесці чарговае пасяджэнне Клуба вясёлых і знаходлівых, завітаць у клас і пацікавіцца жыццём вучняў малодшых класаў, аказаць неабходную ім дапамогу. І заканамерна стала сапраўдным лідэрам школы, сакратарам яе пярвічнай арганізацыі Беларускага патрыятычнага саюза моладзі.

Вучобу ў школе Вікторыя закончыла з залатым медалём. І калі паўстала пытанне аб выбары будучай прафесіі, маці жадала і каб дачка пайшла яе шляхам — паступала на педагагічны факультэт. Але ніякія ўгаворы не дапамаглі. Вікторыя даўно пераканалася, як нялёгка цяпер даводзіцца настаўніку, асабліва вясковаму. А яе прывабіла юрыспрудэнцыя.

Паступала на юрфак Белдзяржуніверсітэта. Як заўсёды конкурс тут быў — не параўнаць з іншымі. Толькі медалістаў на кожнае бюджэтнае месца аказалася больш чым па абітурыенту. Словам, першая спроба (магчыма, з-за слабейшай падрыхтоўкі ў параўнанні з гарадскімі выпускнікамі школ, з-за адсутнасці вопыту ці па якой-небудзь іншай прычыне) аказалася няўдалай.

Са сталіцай давялося развітацца і паспрабаваць шчасця ў цэнтры Беларускага Палесся. Праўда, ужо на платнай аснове. І тут ужо спадарожнічала ўдача. Вікторыя стала першакурсніцай юрыдычнага факультэта нашага універсітэта.

Сёлетні год для дзяўчыны са славутай Мазыршчыны — асаблівы. Па-першае, як і для яе аднакурснікаў, ён стаў пачатковым у XXI стагоддзі і трэцім тысячагоддзі. Па-другое, адбыліся выпрабаванні першай у жыцці зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. Вікторыя вытрымала іх на "выдатна". Нарэшце, у пачатку студзеня яна адзначыла сваё 18-годдзе. Значыць, восенню ўпершыню будзе прымаць удзел у выбарах. Яны ж будуць самымі важнымі. Нам давядзецца назваць імя свайго прэзідэнта. І калі пра гэта зайшла размова, Вікторыя неяк прыкметна ажывілася, як бы хацела падзяліцца сакрэтам, за каго мае намер аддаць свой голас. Але і без тлумачэння было відавочна, каго яна хоча бачыць кіраўніком нашай незалежнай суверэннай дзяржавы. Гэта, канешне, не прадстаўніка шматхвалявай, шматабяцаючай, падтрымліваемай і фінансуемай з-за рубяжа апазіцыі, а вопытнейшага кіраўніка і палітыка, хто будзе мець самы высокі рэйтынг у сваіх выбаршчыкаў.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: Вікторыя Савошчанка.**

**Фота У.Чысціка.**

Зімовая сесія — у лічбах

# РЭЗЕРВЫ ЁСЦЬ...



**Ідзе чарговы вучэбны семестр, і студэнты паспелі ўжо забыцца на клопаты здавалася б яшчэ такой нядаўняй зімовай сесіі. Для кагосьці яна была першай і таму асабліва хвалюючай, а для астатніх — чарговым выпрабаваннем. Але ў любым выпадку яна патрабавала ад кожнага студэнта найвышэйшай сканцэнтраванасці, сур'ёзнасці, адказнасці. Як жа справіліся з гэтай задачай студэнты ГДУ? Гэта пытанне карэспандэнт нашай газеты адрасавала начальніку вучэбнага аддзела Н.І.ПАПКОВАЙ.**

— Адзначу, што ў параўнанні з мінулагодняй зімовай сесіяй, адметных зрухаў зараз у лепшы або горшы бок не адбылося. Сёлетні працэнт паспяваючых студэнтаў па універсітэту, якія здавалі сесію, склаў 81,2. Але ў сувязі з тым, што на экзамены не з'явіліся па няўважлівых прычынах 267 юнакоў і дзяўчат і 67 — па ўважлівых, абсалютны працэнт склаў 75,6. Цяпер самым лепшым чынам зарэкамендавалі сябе студэнты факультэта замежных моў: у іх найвышэйшы паказчык па ўзроўню ведаў — 95,8% (абсалютны працэнт — 87,3). За імі ўпэўнена ідуць будучыя біёлагі — 92,3% (92,1%), факультэт фізічнай культуры — 87,9% (71,4). "Залатую" сярэдзіну займаюць матэматыкі (87,5%), юрысты (83,4%), псіхолагі — 82,2% (80%). Студэнты фізічнага факультэта дасягнулі рубяжу 82% (79,7%). Аднолькавы ўзровень ведаў — 76,2% — у гістарычнага і эканамічнага факультэтаў. І ў ролі "замыкаючых" апынуліся філалагічны — 71,5% (69,7%) і геолага-геаграфічны факультэты (70,2%).

Падводзячы вынікі здачы экзаменаў, мы заўсёды асаблівую ўвагу звяртаем на тое, як прайшло выпрабаванне на веды ў першакурснікаў, і асабліва ў медалістаў. З атрыманых, у прыватнасці, апошнімі адзнак прыкметна заўважаецца вышэйшая паспяховасць выпускнікоў гарадскіх школ, ліцэяў. Юнакі і дзяўчаты з сельскай мясцовасці, на жаль, на першай сваёй сесіі замест добрых і выдатных адзнак атрымліваюць здавальняючыя. Сёлетні абсалютны працэнт паспяховасці першакурснікаў склаў 72,5%. Ніводнай двойкі не атрымалі ў час першага "баявога хрышчэння" будучыя правазнаўцы і першакурснікі факультэта замежных моў. "Вызначыліся" у адваротным плане студэнты гістарычнага, геолага-геаграфічнага факультэтаў і спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю". Тут выкладчыкамі пастаўлена шмат двоек.

Пасля праведзенага аналізу лічбаў вывад напрошваецца адзін: шмат яшчэ неабходна працаваць кіраўнікам факультэтаў, выкладчыкам кафедр, а галоўнае, самім студэнтам, каб павышаць узровень паспяховасці ва універсітэце. Рэзервы для гэтага ёсць. Яны — у больш сур'ёзных адносінах да вучобы і адказнасці за яе вынікі.

# АБ ДЗЕЙНАСЦІ ВЕТЭРАНАЎ

Ва універсітэце адбыўся агульны сход універсітэцкай арганізацыі ветэранаў вайны, працы і Ўзброеных Сіл. Са справаздачай аб рабоце за 2000 год выступіў старшыня яе Савета палкоўнік у адстаўцы А.А.Косцікаў.

У абмеркаванні справаздачы прынялі ўдзел А.С.Калугін, П.Ф.Мажайскі, старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі і інш.

Работа названай грамадскай арганізацыі за справаздачны перыяд прызнана здавальняючай. Яе ўдзельнікі выбралі дэлегатаў на раённую канферэнцыю ветэранскай арганізацыі, зацвердзілі план сваёй работы на бягучы год.

У рабоце справаздачнага сходу прынялі ўдзел рэктар універсітэта прафесар М.В.Селькін, прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін, старшыня абласнога Савета ветэранаў вайны, працы і Ўзброеных Сіл М.В.Ігнаценка і старшыня раённай арганізацыі — В.І.Карніенка.

М.В.Селькін і М.В.Ігнаценка прынялі ўдзел у абмеркаванні заслуханай справаздачы.

# ПРА НЕЗАБЫЎНЫ ПОДЗВІГ

Напярэдадні свята — Дня абаронцаў Айчыны і Ўзброеных Сіл Рэспублікі Беларусь цёпла і сардэчна сустракалі першакурснікі філалагічнага факультэта ганаровых гасцей: старшыню Савета ветэранаў ГДУ палкоўніка ў адстаўцы А.А.Косцікава і члена абласнога Савета афіцэраў палкоўніка ў адстаўцы У.У.Клыгу.

За плячыма ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны са шматлікімі ўзнагародамі на грудзях — суровая школа жыцця, цяжкія франтавыя шляхі-дарогі, горыч страт баявых сяброў і радасць перамогі над фашысцкімі захопнікамі, воінская служба ў мірны час. Яны нагадалі студэнцкай моладзі гісторыю ўтварэння Ўзброеных Сіл краіны, падзяліліся сваімі ўспамінамі аб баявых аперацыях, у якіх удзельнічалі, заклікалі быць патрыётамі сваёй Айчыны, мацаваць яе абараназдольнасць.

Удзячныя слухачы падарылі гасцям на памяць кнігі, пачаставалі смачным тортам, а студэнты гр. Б-11 выступілі з інсцэніроўкай Калядных вячорак.

Арганізатар сустрэчы дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Т.І.Язэпава падзякавала ветэранам за іх цікавыя расказы, павіншавала са святам абаронцаў Айчыны і выказала спадзяванне на новыя сустрэчы з імі ў студэнцкіх аўдыторыях ГДУ.

# ЧТО ТАКОЕ ПО-НАСТОЯЩЕМУ КРАСИВАЯ ЖЕНЩИНА?



*Женщина – грезы, мечта и*
*желанье,*
*Радость, услада, утеха в беде.*
*Женщина – дружба, любовь,*
*championship*

Сначала надо принять себя такой, какая есть, и найти свою индивидуальность. Молодые люди обращают внимание не на цвет глаз, а прежде всего на красоту взгляда. Очарование девушке придает не столько ладная фигура, сколько красивые жесты и изящная походка. По походке, осанке, жестам девушки можно сразу сказать, будет она пользоваться успехом у мужчин или нет. Самая красивая и модная одежда уродливо выглядит на девушке, которая не умеет ее носить. А вот заняться этим серьезно, выработать свою, особенную манеру держаться, найти и развить свою «изюминку» под силу любой женщине.

Умная женщина – та, в обществе которой можно держать себя как угодно глупо.

**П.Валери.**

Мужчина велик на земле и в веках, но каждая йота его величия выросла из женщины.

**У.Уитмен.**

Природа сказала женщине: будь прекрасной, если можешь, мудрой, если хочешь, но благоразумной ты должна быть непременно.

**П.Бомарше.**

Женский инстинкт стоит прозорливости великих людей.

**О.Бальзак.**

Кто не видел влюбленной женщины, тот не может сказать, что такое женщина.

**Т.Готье.**

Женщины, как и сны, никогда не бывают такими, какими хочешь их видеть.

**Л.Пиранделло.**

Слезы — женское красноречие.

**Ш.Сент-Эвремон.**

Уважать женщин – это долг, которому всякий честный человек должен повиноваться с рождения.

**Лопе де Вега.**

Бог делает женщину прекрасной, а дьявол – хорошенькой.

**В.Гюго.**

# ПУТИ К ПЕДАГОГИЧЕСКОМУ

**(Продолжение. Начало в № 4)**

### О БИНАРНОМ ХАРАКТЕРЕ СОДЕРЖАНИЯ ПРАКТИКИ

Серьезного внимания заслуживает более совершенное определение содержания практики. Во многих методических работах и при проведении практики это содержание сводится главным образом к перечислению тех видов учебной и воспитательной деятельности, которые необходимо выполнить практикантам в школе или других учебных заведениях, где проводится практика. Однако это только одна ее содержательная сторона. Второй стороной содержания практики является система тех профессионально-педагогических умений и навыков, которые необходимо вырабатывать у себя студентам.

Таким образом, содержание практики носит по существу бинарный характер, что имеет немаловажное значение для ее проведения. Например, важно не только спланировать и провести серию уроков различных типов, но и четко представлять, какими умениями и навыками следует овладеть студентам. Между тем часто бывает, что основной акцент делается только на проведении и анализе уроков практикантов и не обращается должного внимания на то, как происходит у последних процесс выработки учебно-воспитательных умений и профессионально-личностных свойств и качеств.

### ЭТАПНОСТЬ ПРАКТИКИ И ТЕХНОЛОГИЯ ТРЕНИРОВОЧНО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СТУДЕНТОВ

Есть необходимость и в более рациональном формировании у студентов самих дидактико-методических и воспитательных умений и навыков как основы педагогической умелости. Процесс этот весьма сложный и включает в себя сначала неумелую деятельность, потом недостаточно умелую деятельность, затем деятельность более умелую, переходящую при настойчивой последующей тренировке в педагогическое мастерство. Все это обуславливает необходимость выделения в процессе практики ее отдельных содержательных этапов, которые отражают указанную ступенчатость тренировочной деятельности студентов. К ним, в частности, относятся этапы: ознакомительно-адаптационной деятельности, пробно-тренировочной деятельности, закрепляюще-тренировочной деятельности и, наконец, тренировочно-оценочный. Наш опыт показывает, что выделение этих этапов придает ходу практики целенаправленный и более продуктивный характер.

Но и сама тренировочная деятельность по непосредственной выработке педагогических умений и навыков имеет свою специфическую технологию. Первым элементом этой технологии является то, чтобы студент конкретно определял ее целевую направленность. Например, идя на урок, студенту следует ставить перед собой цель овладеть различными методами изложения нового материала или эвристическими приемами стимулирования учебной работы. В других же случаях в качестве таких конкретных целей может быть выработка умения сочетать обучение и воспитание, развитие у себя культуры отношений с учащимися. Кое-кто может сказать, что все эти цели обычно ставятся и достигаются одновременно и в тесной связи между собой. Частично это так. Однако нельзя забывать, что тренировочная деятельность в этом случае может осуществляться на основе недостаточно сформированных умений и навыков. И вот, чтобы ее усовершенствовать и перевести в стадию более высокой умелости, студенту и нужно ставить специальные цели. Но делается это далеко не всегда, что следует считать существенным упущением.

Исключительно важной в технологии тренировочной деятельности практикантов является и следующая деталь. Поскольку всякая первоначальная деятельность обычно носит неумелый характер, нужно добиваться того, чтобы эта деятельность осуществ-

Конкурсы

# ПРЭМІІ —МАЛАДЫМ



Гомельскі аблвыканкам аб'явіў чарговы конкурс навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, дактарантаў, магістраў, інжынерна-тэхнічных работнікаў **ва ўзросце да 33 гадоў,** якія займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю па аднаму з навуковых накірункаў, распрацоўваемых у ВНУ, навукова-даследчых, доследна-канструктарскіх і праектных арганізацыях, на прадпрыемствах і г.д.

**Абласны выканаўчы камітэт зацвердзіў 10 прэмій па наступных конкурсных раздзелах:**

— **чатыры прэміі ў памеры 20 мінімальных заработных плат кожная** за ўдзел у выкананні прыкладных распрацовак;

— **дзве прэміі ў памеры 15 мінімальных заработных плат кожная** за вынаходніцкую дзейнасць;

— **чатыры прэміі ў памеры 10 мінімальных заработных плат кожная** за ўдзел у выкананні фундаментальных даследаванняў.

## УМОВЫ КОНКУРСУ

Работы, якія падаюцца на конкурс, могуць быць індывідуальнымі і калектыўнымі да трох чалавек.

На конкурс прадстаўляюцца навукова-даследчыя работы, якія атрымалі прызнанне навуковай грамадскасці (апублікаваныя ў друку, даложаныя на навуковых канферэнцыях не ніжэй рэспубліканскага ўзроўню) і ўтрымліваюць рашэнні важных для навукі, вытворчасці, эканомікі і сацыяльнай сферы задач.

Работы, што раней былі ўзнагароджаны іншымі конкурснымі прэміямі, да разгляду не прымаюцца.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца маладыя навукоўцы і спецыялісты, якія маюць не менш 3 публікацый у міжнародных або рэспубліканскіх часопісах. Пры гэтым усе публікацыі павінны быць выкананы на працягу трох гадоў, што папярэднічалі правядзенню дадзенага конкурсу.

Вылучэнне кандыдатаў ажыццяўляюць вучоныя Саветы, Саветы маладых вучоных ВНУ, навуковых, праектных і доследна-канструктарскіх арганізацый, а таксама навукова-тэхнічныя і тэхніка-эканамічныя Саветы прадпрыемстваў і арганізацый Гомельскай вобласці.

**Матэрыялы будуць прымацца да разгляду з 1 кастрычніка да 1 лістапада 2001 года.**

* * *

## НА ЛЕПШУЮ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧУЮ РАБОТУ

Аб'яўлены конкурс на лепшую навукова-даследчую работу нашага універсітэта. Ён праводзіцца ў тры этапы: кафедра — факультэт — конкурсная камісія.

Работы ў конкурсную камісію неабходна прадставіць да 30 сакавіка 2001 года.

За даведкамі звяртацца ў службу НТІ навукова-даследчага сектара: 5 корпус, кабінет 4-9, тэл. 57-77-11.



**На кафедры securityбатанікі і фізіялогіі раслін біялагічнага факультэта нашага універсітэта значная ўвага ўдзяляецца паляпшэнню навуковых даследаванняў.**

**На здымку: аспірант Уладзімір Собчанка і асістэнт кафедры Аляксандр Гарнасталёў за вывучэннем марфалагічнай структуры і біяметрычных паказчыкаў паддоследных раслін.**

**Фота У.Чысціка.**

Памяць

# З КАГОРТЫ ВЫДАТНЫХ АЛГЕБРАІСТАЎ



**У** развіццё вышэйшай школы на Гомельшчыне вялікі ўклад унёс доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар С.А.Русакоў. Яго навуковая і педагагічная дзейнасць садзейнічала павышэнню ўзроўню матэматычнай адукацыі як у Гомельскім дзяржуніверсітэце імя Ф.Скарыны, так і ў Беларускім дзяржуніверсітэце транспарту.

Сцяпан Афанасьевіч нарадзіўся ў вёсцы Будовы Лог Добрушскага раёна ў сялянскай сям'і. Па заканчэнні Гомельскага педінстытута імя В.П.Чкалава быў рэкамендаваны ў аспірантуру. Так ён стаў вучнем акадэміка С.А.Чуніхіна, які ў той час узначальваў кафедру вышэйшай матэматыкі Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту.

Ужо ў самым пачатку сваёй навуковай кар'еры С.А.Русакоў атрымаў выдатныя вынікі і даказаў тэарэмы, якія цяпер уваходзяць у манаграфіі і дапаможнікі па алгебры. Узровень кандыдацкай дысертацыі маладога вучонага быў такім высокім, што яе прынялі да абароны ў вядучым навуковым цэнтры краіны — Матэматычным інстытуце Акадэміі навук СССР. У час абароны, якая прайшла вельмі паспяхова, адзін з выдатных савецкіх матэматыкаў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі А.І.Кастрыкін адзначыў, што С.А.Русакоў атрымаў шэраг тонкіх і цікавых вынікаў, якія маюць перспектыву развіцця. Цяпер, з вышыні пройдзеных гадоў, гэта прадбачанне поўнасцю апраўдалася.

Стаўшы кандыдатам навук, Сцяпан Афанасьевіч на дасягнутым не спыніўся. Яго навуковыя артыкулы перыядычна публікаваліся ў вядучых матэматычных часопісах, у тым ліку і ў "Докладах Академии наук СССР".

Навуковая дзейнасць С.А. Русакова на працягу многіх гадоў праходзіла ў Гомельскім аддзяленні Інстытута матэматыкі Акадэміі навук нашай рэспублікі. Адначасова ён вёў і выкладчыцкую працу, удасканальваў сваё лектарскае майстэрства. Яго памятаюць як аднаго з арганізатараў кафедры алгебры і геаметрыі, якая была створана ў былым Гомельскім педінстытуце.

Ужо ў далёкім 1968 годзе ў Гомелі праходзіла Усесаюзная алгебраічная канферэнцыя, членам аргкамітэта якой з'яўляўся С.А.Русакоў. На той форум матэматыкаў сабралася звыш 300 навукоўцаў, з удзелам якіх прынялі рашэнне ў падтрымку ад-крыцця ў горадзе над Сожам дзяржаўнага універсітэта. І на наступны год ён быў адкрыты. Так пачыналася гісторыя ГДУ і далейшы рост Сцяпана Афанасьевіча як універсітэцкага лектара. Тут яшчэ задоўга да абароны сваёй доктарскай дысертацыі ён атрымаў вучонае званне прафесара і гэта было зусім справядліва, так як яго выкладчыцкае майстэрства даўно дасягнула прафесарскага ўзроўню. А ў тым, што Сцяпан Афанасьевіч стане доктарам, ніхто з яго калег, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, не сумняваўся.

Напрацягу шматлікіх гадоў С.А.Русакоў паступова, крок за крокам, ствараў у Гомелі зусім новы навуковы накірунак, які быў звязаны з тэорыяй мнагамесных функцый — своеасаблівым фундаментам тэорыі аўтаматаў. У гэтым напрамку вучоны рашыў шэраг буйных навуковых праблем сусветнага ўзроўню. Сярод іх можна адзначыць такое зробленае ім адкрыццё, як невырашальныя паліадычныя групы біпрымарнага і няцотнага парадку. Да распрацоўкі новага навуковага напрамку С.А.Русакоў далучыў сваіх лепшых вучняў, многія з якіх сталі кандыдатамі навук.

Абарона доктарскай дысертацыі С.А.Русакова праходзіла на пасяджэнні вучонага Савета Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны і стала сапраўдным святам для ўсіх матэматыкаў. Калі ў час абароны быў агучаны водзыў загадчыка кафедры вышэйшай алгебры Маскоўскага універсітэта імя М.В.Ламаносава прафесара А.І.Кастрыкіна, адразу стала зразумелым, што ў Гомелі з'явіцца імя яшчэ аднаго новага доктара навук.

Апошні перыяд дзейнасці С.А.Русакова (ён ушоў з жыцця год таму) быў звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам транспарту, дзе вучоны загадваў кафедрай вышэйшай матэматыкі. Слухаючы лекцыі прафесара С.А.Русакова, сотні інжынераў атрымалі грунтоўную матэматычную падрыхтоўку.

Мне неаднаразова даводзілася ўдзельнічаць у міжнародных матэматычных канферэнцыях, у тым ліку і ў далёкім замежжы. І я магу засведчыць, наколькі вялікі аўтарытэт С.А. Русакова ў навуковых колах. Яго вучні і паслядоўнікі працуюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах — Расіі, Польшчы, Югаславіі, Іарданіі. Дзве ягоныя навуковыя манаграфіі апублікаваны ў Мінску ў акадэмічным выдавецтве і атрымалі шырокую папулярнасць сярод матэматыкаў-алгебраістаў.

Гісторыя ствараецца людзьмі, якія самі становяцца гісторыяй. Сцяпан Афанасьевіч Русакоў — адзін з тых, пра каго заўсёды будуць успамінаць з удзячнасцю.

**Л.ШАМЯТКОЎ,**
**ганаровы рэктар Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.**

Правильно ли мы говорим?

# ЧТО НАМ ДЕЛАТЬ С "ДВУХТЫСЯЧНО ПЕРВЫМ ГОДОМ"?



**Наступило новое тысячелетие. А вместе с ним и проблема в произношении и написании годовых исчислений двадцать первого столетия. Дикторы телевидения и радио в прямом эфире поначалу часто сбивались, говоря о событиях, которые должны произойти в период "двухтысячно первого" года. А теперь эта форма склонения составных порядковых числительных, как видно, и вовсе вошла в привычку. Так говорят почти все, включая многих филологов. Правильно ли это?**

Думаю, что на склонение числительного с двумя тысячами оказал влияние предыдущий год, который мы называем "двухтысячным". Однако если верить авторам учебников по русскому языку, то при склонении "в составных порядковых числительных изменяется только последняя часть, а все остальные остаются без изменения" (Розенталь Д.Э. Современный русский язык. — М., 1991. — С. 270).

И, правда, как мы писали и произносили порядковые исчисления годов в минувшем тысячелетии? Мы говорили: "Я выхожу на защиту диссертации в тысяча девятьсот девяносто восьмом году" (не в тысячно девятьсот девяносто восьмом!). Ведь никогда не было формы "в тысячно девятисотом" году, всегда говорили и писали "в тысяча девятисотом году", "в тысяча девятьсот первом году".

Вряд ли исчисления двухтысячных годов должны изменить свою парадигму склонения. Исходя из установленных в русском и белорусском языках правил склонения составных порядковых числительных мы, вероятно, должны говорить: "был составлен план научной работы на две тысячи первый — две тысячи пятый годы" (а не "на двухтысячно первый" или "двухтысяче первый"). Другое дело — склонение сложных слов в составе количественно-именного сочетания (счетного оборота) с порядковым числительным и словом "лет" (месяцев, дней, часов) типа "двухлетие", "пятисотлетие", что в результате даст форму "двухтысячепятисотлетие". Или, применительно к реальному времени третьего тысячелетия, мы должны будем говорить, что в 2001-м году весь христианский мир отпразднует "двухтысячеоднолетие Рождества Христова".

Таким образом, летом две тысячи первого года абитуриенты всех городов и весей Белорусского Полесья будут штурмовать наш университет.

Если я не права, пусть кто-то докажет обратное.

**Т.АВДОНИНА,**
**доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**

# МАСТЕРСТВУ

лялась ими не в классе, как это часто бывает, а до классных учебных и воспитательных занятий и носила характер имитационного проигрывания. Это значит, что содержание и методику предстоящего урока или воспитательного мероприятия студенту необходимо несколько раз «проиграть» до их непосредственного проведения с учащимися. Только таким путем, как показывает наш опыт, студент избегает психологических стрессов и неудач, которые подчас происходят при проведении первых учебных и внеклассных занятий.

Для этого нами разработан специальный методический алгоритм подготовки практикантов к урокам и воспитательной работе. Он включает в себя следующие виды подготовительной деятельности: консультацию у преподавателя-методиста или учителя по содержанию, целям и методике предстоящего урока или внеклассной работы; проработку содержания урока или воспитательного мероприятия по учебнику и другим пособиям; разработку плана-конспекта или развернутого рабочего плана занятий; обсуждение этого плана-конспекта с учителем или руководителем практики; работу по усвоению содержания плана-конспекта занятий путем его активного воспроизведения; двух-трехразовое практическое имитационное проигрывание методики проведения занятий.

Мы убедились, что когда студент осуществляет элементы этого методического алгоритма, он ощущает свою надежную подготовленность к занятиям и идет в класс с определенной верой в успех. Именно таким образом студенты довольно быстро переходят от этапа пробно-тренировочной деятельности к деятельности закрепляюще-тренировочной и в конце практики проводят занятия с учащимися с довольно ощутимым успехом. Естественно, что постепенно более рациональным и сжатым становится осуществление методического алгоритма подготовки к урокам и воспитательным мероприятиям, а студенты быстрее и основательнее овладевают профессионально-педагогическими умениями и навыками.

**И.ХАРЛАМОВ,**
**профессор, академик НАН Беларуси, зав. кафедрой педагогики.**

**В.ГОРЛЕНКО,**
**доцент кафедры педагогики.**

**(Заканчэнне ў наступным нумары газеты).**



**На геолого-географическом факультете был проведен конкурс на лучший фантастический рассказ, победителями которого стали студенты пятого курса Олеся и Сергей Сергейчиковы. Предлагаем вниманию читателей их рассказ.**

# 50 ЛЕТ СПУСТЯ

Проснулась я от того, что кто-то тряс меня за плечо; выработанная годами привычка заставила меня подскочить на кровати, — иначе будильник стукнет током. Как только я спустила ноги с кровати, на меня напрыгнул халат и тапочки (один тапок промазал и разбился о стену).

С мыслями о регулировании тапкобросателя я отправилась на кухню, где Чуча (мой верный хомяк) уже накрыл на стол и ждал похвалы. Вдохнув зубную пасту и разбудив мужа, я села за стол (Сергей вскоре присоединился). Мы решили, что Сережа немного опоздает, т.к. ему необходимо сходить к врачу, иначе из-за гайморита у него заржавеют носовые пазухи.

Пора в универ. Мы с Серым, как учащиеся 23 курса Повышенной ступени образования, на которую после 2020 года перешла большая часть населения Планеты, не должны опоздать. Помнится, еще когда-то, в пошехонскую старину, когда население Планеты делилось на страны и были деньги, за опоздания могли лишить стипендии. Но это уже в прошлом.

Обучение у нас теперь индивидуальное — максимум 3 человека. Сегодня я была одна. Появилась Н.Н. в своем ультрамодном энергетическом костюме, с электроподогревом. «Здравствуйте, Н.Н.» — подумала я.

«Здравствуй, Олеся, что, остальных сегодня не будет?» — подумала она.

Между парами я не стала выходить из аудитории. И вдруг за окном я заметила мохнатую голову Сережки: «На уровне четвертого этажа и без шлема?!» На что мой муж-озорник ответил: «Олеська, нам всего лишь по 71 году, нужно веселиться, пока молодые».

После изобретения вакцины долголетия в 2010 году, когда все остались, как были, мы завакцинировались 30-летними (нам еще повезло).

Вдруг вошел Ю.П., забрал мой шлем, противокислотную куртку, и злобно глянув на Сергея за окном, подумал: «Через тысячную долю секунды — у меня в кабинете».

Посетив это гостеприимное место, мы узнали, что за не сданные в гардероб вещи я должна буду вымыть три университетских звездолета, и что нас с Сергеем отправляют по распределению на планету Прилуксия, правителем которой является И.О.

«Полетели в 3-й корпус» — послал мысль Серега, зазывно глянув мне в глаза. Я не смогла избавиться от искушения, и мы полетели. Старый добрый 3-й корпус... Здесь все осталось, как в 2000-м, даже внутри здания еще не убрали ртуть и сохранились остатки кислорода. Невольно начали приходить воспоминания — вот мы стоим с И.И. и А.И. и обсуждаем практику. А вот на Сергея упало 2 кг известки с потолка... А самое яркое воспоминание — весна, распахнутые окна, свежий запах молодой зеленой травы и Солнце...

«Летим в «Дубраву», там заканчивается раздача кислорода», — прервал мои мысли дед Серега. «Проклятые кислородоголики» — подумала я.

Мы надели респираторы, застегнули противокислотные капюшоны (пошел дождь) и шагнули на измученную, израненную Землю.

# НА ЎСПАМІН СВАІМ НАШЧАДКАМ

Незвычайная выстава адкрылася ва універсітэцкім музеі Ф.Скарыны. Яна прысвечана памяці пайшоўшага нядаўна з жыцця выдатнага вучонага-славяніста, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі нашай краіны У.В.Анічэнкі. Пра яго насычанае жыццё, навукова-педагагічную дзейнасць, плённую працу ў галіне мовазнаўства расказваюць шматлікія навуковыя працы, фотаздымкі, узнагароды за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне і творчыя здабыткі ў мірны час, разнастайныя дакументы.

Выставу адкрыў ганаровы рэктар універсітэта, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

Цёпла гаварылі пра свайго былога настаўніка і калегу дацэнты кафедры беларускай мовы В.А.Ляшчынская і Н.А.Багамольнікава, а таксама загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар І.Ф.Штэйнер.

У дзень адкрыцця выставы наведвальнікі з цікавасцю азнаёміліся з каштоўнымі матэрыяламі яе экспазіцыі.

# ХОЧАЦЕ ВЕДАЦЬ, КОЛЬКІ ГАДОЎ У ВАС ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ?



Тады лічыце. У вас ёсць усе шансы дажыць да 78 гадоў, калі вы будзеце прытрымлівацца 6-ці або 7-мі рэкамендацый. Калі вам дастаткова ўсяго 73 гады, то выконвайце 4-5 рэкамендацый. Калі вам хапае сіл толькі на 1-2 нашых парады, тады ледзь дацягнеце да 67-гадовага ўзросту. Аб якіх рэкамедацыях ідзе размова?

**Не курыць.**

**Быць фізічна актыўным.**

**Спаць 7-8 гадзін у суткі.**

**Алкаголь ужываць як мага радзей і ведаць меру.**

**Харчавацца ўмерана некалькі разоў на дзень.**

**Утрымліваць масу цела адпаведна ўзросту.**

**Добра снедаць.**

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺

# РАЗВЕДЧИКИ ТОЖЕ ШУТЯТ...

- Какой же русский не любит быстрой езды? Тот, на котором едут.
- Губят Россию грамотность без культуры, выпивка без закуски и власть без совести.
- Простим любую глупость, лишь бы человек не умничал.
- Исторический путь — от культа личности к культу наличности.
- Люди готовы испить любую чашу, была бы закуска.
- Права личности у нас надежно защищены. Беззащитна сама личность.
- Правительство выдержит любую клевету, но не переживет правды.
- Президент не может обойтись без народа. Это его слабое место.
- Дожил до незаслуженной старости.
- С волками жить — по-волчьи выть. Но стоит ли хрюкать вместе со свиньями?
- Когорта великих сыновей недостойного отечества.
- Руководство ничуть не поглупело, народ поумнел.

**(Шебаршин Л.В. Хроники безвременья. М., 1998).**

**Собрал А.Е.РЫЧКОВ,**
**ст.преподаватель кафедры политической социологии.**

☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺☺



## *УЛЫБНИТЕСЬ!*

Встретились две старые подруги.

— Ты решила вернуться к своему мужу? — спрашивает одна.

— Да, не могу спокойно смотреть, как этот мерзавец живет в свое удовольствие!

* * *

Молодая женщина, недавно вышедшая замуж, хвастается подругам:

— Девочки, я знаю прекрасный рецепт котлет! Как только я говорю мужу, что собираюсь их приготовить, он сразу же ведет меня в ресторан.

* * *

Дама резко тормозит перед зданием автошколы, помяв и поцарапав при этом несколько автомобилей, и требует директора:

— Дайте мне срочно другого инструктора. У того слабака, которого я привезла, инфаркт.





# ТУРНІР ПАМЯЦІ А.С.ШАГІНЯНА

У шасці спартыўных залах нашага горада (ГДУ, ГДТУ, ГКІ, ДЮСШ-1, ДЮСШ-2 і "Гомельдрэў") "скрыжавалі зброю" майстры вялікай ракеткі. Тэнісны турнір памяці акадэміка Міжнароднай інжынернай акадэміі А.С.Шагіняна, былога рэктара ГДТУ імя П.О.Сухога, быў арганізаваны тэхнічным універсітэтам і аддзелам па ФКСіТ Гомельскага гарвыканкама. Спонсарамі турніру былі ГПТН "Дружба", ААТ "Гомельшпалеры", ААТ "Гомельдрэў", ВА "Беларусьнафта", "Праммантажсервіс", БМЗ, ГКІ, ГДУ імя Ф.Скарыны.

У 2-х дзіцячых узроставых катэгорыях за прызы турніра змагаліся каля 80 дзяцей з усёй Беларусі, а таксама з Масквы і Украіны. Асабліва моцным было прадстаўніцтва ў малодшай групе дзяўчынак, дзе ўдзел прымалі 6 тэнісістак з першай дзясяткі рэйтынга.

У "дарослай" частцы турніра сапернічалі амаль 40 тэнісістаў г.Гомеля. Тры з іх прадстаўлялі наш універсітэт. Паспяхова выступілі аспірант эканамічнага факультэта С.Капшай і студэнт 1 курса гэтага ж факультэта Я.Зашчук, якія ўвайшлі ў дзясятку мацнейшых. Лепшых вынікаў у турніры дабіўся дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі В.Капшай. У адзіночным разрадзе ён атрымаў 5 перамог і толькі ў фінале ўступіў выпускніку ГДТУ П.Быкоўскаму. У парным разрадзе В.Капшай выступаў разам з С.Курловічам, выкладчыкам кафедры матэматыкі ГДТУ. Пасля 5 перамог яны дайшлі да фінала, дзе ў вельмі ўпартым трохсетавым матчы, які працягваўся больш за дзве гадзіны, аказаліся мацнейшымі (7:6, 5:7, 6:4). Дарэчы, фіналы ўсіх катэгорый турніра прайшлі ў Палацы гульнёвых відаў спорту пры вялікай колькасці гледачоў.

Турнір праходзіў на працягу двух тыдняў. Аб добрай падрыхтоўцы і ўпартасці барацьбы як юных, так і дарослых спартсменаў сведчыць, напрыклад, той факт: гульні ў залах пачыналіся ў 8 гадзін раніцы, а заканчваліся бліжэй да паўночы.

**(Наш. кар.)**

Заўвагі робіць калега

# НЕАПРАЎДАНАЯ АДАСОБЛЕНАСЦЬ

Больш за год спартклуб нашага універсітэта ўзначальвае Барыс Мікалаевіч Гіль. Тэрмін дастатковы, каб ацаніць тое, што змагла зрабіць гэта грамадская арганізацыя пры новым кіраўніку.

Любая грамадская арганізацыя абавязана мець план работы, які павінен зацвярджацца на пасяджэнні спартклуба. Другі год спартклуб працуе без плана.

Ствараецца ўстойлівае ўражанне, што спартклуб з'яўляецца структурным падраздзяленнем факультэта фізічнай культуры, а не ўсяго універсітэта.

Б.Гіль — рэдкі госць на пасяджэннях кафедры фізічнага выхавання і спорту, дзе абмяркоўваюцца пытанні спартыўна-масавай работы на факультэтах.

Ёсць заўвагі да дырэктара спартклуба і ў намеснікаў дэканаў па спартыўна-масавай рабоце. Так, напрыклад, тэрміны правядзення спаборніцтваў ва універсітэце не ўзгадняюцца з намеснікамі дэканаў і не зацвярджаюцца на пасяджэннях спартклуба.

Не было ніводнага пасяджэння спартыўнага клуба і трэнерскага савета. А дзе падвядзенне вынікаў на лепшага трэнера-выкладчыка па выніках спартыўнага года?

Без папярэдняй згоды Б.Гіль назначае галоўных суддзяў на універсітэцкія спаборніцтвы, чым выклікае непавагу калег.

Спаборніцтвы праходзяць будзённа: без урачыстага адкрыцця і закрыцця спаборніцтваў, іншымі словамі спаборніцтвы не пераўтвараюцца ў свята.

Другі год ад спартклуба не ідуць ідэі па аздараўленню студэнтаў, якім вельмі патрэбна гэта.

Канулі ў вечнасць універсітэцкія легкаатлетычныя кросы. Можа быць у той форме, як яны праходзілі, іх і не трэба праводзіць, але асенні крос першакурснікаў — проста неабходны. Гэта меркаванне намеснікаў дэканаў па спартыўна-масавай рабоце.

Дзіўным выглядала падвядзенне вынікаў 2000 спартыўнага года, дзе некаторыя выкладчыкі і нават намеснікі дэканаў па спартыўна-масавай рабоце былі незаслужана "забыты" Барысам Мікалаевічам.

Напрыканцы 2000 года на Савеце універсітэта Б.Гіль рабіў справаздачу ад праведзенай рабоце і было дзіўна пачуць, што ў зборныя каманды універсітэта ўваходзяць усяго пяць студэнтаў агульных факультэтаў, на самой справе іх каля 30. Што гэта, дырэктар спартклуба не валодае пытаннем?

Хочацца спадзявацца, што гэтыя сяброўскія заўвагі Б.М.Гіль успрыме як мінулыя памылкі і пралікі, якія не паўторацца ў будучым.

**В.МАРЧАНКА,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— фізвыхавання і спорту — старшага выкладчыка, выкладчыка;

— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры — загадчыка кафедры.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Калектыў кафедры фізічнага выхавання і спорту смуткуе з выпадку смерці былога загадчыка названай кафедры **БУДЗЮХІНА Івана Дзянісавіча** і выказвае сваё спачуванне яго родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 131
Падпісана да друку 03.03.2001г.